

Нефармат

# ВЯСНА ПРЫЙДЗЕ І РАЗВЕЕ...

ПРАЧЫТАЛА заклік Алены Ляўковіч прачынацца ад зімовай спячкі насустрач вясне і ўсміхнулася: вам, мінчанам, якраз вясну гукаць! У вас там яшчэ снег ляжыць, а пад снегам — дзе-нідзе лёд. А ў нас тут... Першага лютага я ехала ў Жабінку, ад снегу нідзе і следу, азімыя прыгожа зазелянелі. Ужо тыдні паўтары, як у асобных гаспадарках паўднёвых раёнаў тэхніка на палі выйшла. А ў суботу калега з Гродна даслала здымак падснежнікаў, якія вылезлі на клумбе. Значыць, у нас, па вызначэнні, павінны ўжо быць. У іх жа, у Гродне, век халаднавей было, чым у нас. Памятаю, як сын служыў там, дык вечарам па тэлефане, расказвае, што днём снег чысцілі, прыбіралі. А мы дзівіліся, тут яго і блізка не было.

І ўсё ж мінулымі выхаднымі Брэст учыстую прайграў сталіцы. Мінская каляжанка тэлефануе і расказвае: «Прыгожы, сонечны дзень выдаўся, і да таго светла зрабілася на душы, проста нейкае адчуванне, што хочацца ўзняцца і ляцець». А ў нас — і дождж, і вецер, і суцэльная цямнеча, канца якой нiяк не відаць. Гэтым разам неяк асабліва чакаю вясну. Можа, таму, што восень выдалася надзвычай цяжкай, не нашмат лепшай была зіма...

Як высветлілася, не адна я чакаю. Прынамсі, у нашым доме яе чакае яшчэ адзін чалавек. Трохгадовы. Ён зайшоў раніцай у ліфт крыху нібы заплаканы і зусім невясёлы. Бацька яго расказаў, што зранку капрызіў, тупаў нагамі, у садок не хацеў збірацца. Маці ўгаворвала, супакойвала, а потым нарэшце спытала: «Ну чаму ты сёння так дрэнна сябе паводзіш?» — «Таму што вясна не наступае», — выдаў выпускнік ясельнай групы. Выходзіць, у кожнага свае рахункі з вясной.

Бо яна, здаецца, прынясе палёгку, новыя ўражанні, новыя спадзяванні. Абавязкова павінна прынесці. Інакш што гэта за вясна? Неўзабаве заедзем у вёску, а там, можа, ужо мае гіяцынты павылазілі з зямлі, а ў суседзяў прачнуліся цюльпаны. Потым прыляціць бусел з заморскіх краёў. Але гэта крыху пазней, звычайна ў канцы сакавіка. А ў пачатку, да якога, лічы, тыдзень застаўся, з'яўляецца першы бярозавік.

Адзін з самых светлых вясновых успамінаў маладосці звязаны менавіта з бярозавым сокам. Яшчэ ў час работы ў «раёнцы», а значыць, даўным-даўно, цэлай кампаніяй выбраліся на дзялянку, дзе можна было нарыхтоўваць сок. Адсюль выснова — раней таксама бывалі раннія вёсны. Мы паехалі 7 сакавіка, на пярэдадні свята. Вось так раптоўна нехта кінуў ідэю, сабраліся за пяць хвілін і паехалі. Не ведаю, як гэта расказаць: паветра, пахі, першыя зялёныя парасткі, — адным словам, лес яшчэ не быў вясновы, але ён ужо дыхаў вясною. Хлопцы смяяліся: «Нармальныя мужчыны ўжо выпіваюць ды жанчын віншуюць, а мы дзяўчат у лес вывезлі ды прымусілі жалязякі насіць». Мы і сапраўды дапамагалі ў клопатах, бярозу падсочваць інструмент патрэбны, а яшчэ адпаведных посуд і ўсё такое. Паднесці, падаць, патрымаць тады не ўяўлялася цяжкім. Але ж пахадзіць па лесе, злавіць тое самае першае імгненне абуджэння стала асаблівай радасцю. Вось мінская калега гаварыла: «Стан душы такі, што ўзляцець хочацца». Мы сталі шукаць кветкі. Самыя рацыянальныя з нашай кампаніі казалі, што яшчэ не час. Але я знайшла пад леташнімі рудымі лісцямі амаль празрыстыя яшчэ парасткі сіняй пралескі.

Потым, вядома, развялі касцёр, пасядзелі, пагаварылі, паспыталі першы найсвежэйшы бярозавік. А яшчэ зварылі гарбату на бярозавым соку. Здаецца, у той вечар гучалі вершы. Нешта накшталт Багдановічавага: *«Гукне вясна, і як ветрам развее // Гора-нуду»* альбо Коласавага: *«Зашуміць трава густая, // Кветкі ў лузе засмяюцца. // Вясна прыйдзе маладая, // Ўсюды песні панясуцца»*.

Вось вам і адказ, чаму вясны хочацца. Бо яна асацыіруецца з маладосцю года, маладосцю зямлі, маладосцю адчуванняў, якія хіба толькі сапраўдны паэт і можа выказаць родным словам. Дарэчы, сёння Дзень роднай мовы. Добра, што ён адзначаецца ў гэтую пару, напярэдадні вясны. Па радыё адзін чыноўнік нядаўна так прыгожа, аргументавана, пераканаўча гаварыў пра важнасць роднай мовы як асновы ўсяго, як сродку перадачы звычаяў, традыцый, крыніцы падтрымання сувязі паміж мінулым, сучасным і будучым. На чыстай рускай гаварыў. І гэта вельмі па-нашаму. Дык са святам вас! І хай вясна гаворыць з намі мовай ручаёў, пяшчотнай зеляніны, першай пралескі!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## 21 ЛЮТАГА

Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1937** год — нарадзілася Лідзія Іванаўна Цягака, беларускі антраполаг, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар «Нарысаў па антрапалогіі Беларусі», падручніка «Асновы сучаснай антрапалогіі». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1944** год — пачалася наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Беларускага фронту, якая ўвайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Рагачоўска-Жлобінская аперацыя. Удзельнічалі войскі: 3-я армія, частка сіл 50-й і 48-й, 16-я паветраная. Ім супрацьстаяла 9-я нямецкая армія групы войск «Цэнтр», якая займала дзве ўмацаваныя абарончыя палосы і моцныя вузлы супраціўлення ў Рагачове і Жлобіне. 21 лютага савецкія войскі перайшлі ў наступленне і на працягу двух дзён прарвалі абарону праціўніка, фарсіравалі Днепр, перарэзалі чыгуначнае адгалінаванне Магілёў — Рагачоў. 23 лютага падышлі да Рагачова і на наступны дзень штурмам вызвалілі яго, рушылі да ракі Друць, захапілі плацдармы на абодвух берагах Дняпра, падышлі да Жлобіна. У выніку Рагачоўска-Жлобінская аперацыі савецкія войскі нанеслі вялікі ўрон ворагу і стварылі спрыяльныя ўмовы для наступлення ў Бабруйскім напрамку.



**1947** год — нарадзіўся (г. Мазыр) Міхаіл Якаўлевіч Фінберг, дырыжор, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. З 1987 года дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь. Прапагандаваў музыку беларускіх кампазітараў. Арганізатар, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны. У 2016-м атрымаў спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

У свеце

**1613** год — Земскі сабор (найвышэйшая саслоўна-прадстаўнічая ўстанова Рускага царства з сярэдзіны XVI да канца XVII стагоддзя, збор прадстаўнікоў дваранства і духавенства для абмеркавання палітычных, эканамічных і адміністрацыйных пытанняў) аднагалосна абраў Міхаіла Фёдаравіча, сына баярына Фёдара Мікітавіча Раманава, царом, што паклала пачатак дынастыі Раманавых у Расійскай імперыі.



**1804** год — англійскі вынаходнік Рычард Трэвіцік прадэманстраваў публіцы першы паравы воз на рэйкавым пуці — прататып сучаснага паравоза. Падчас выпрабаванняў 4-колавы паравоз вёў 6 вагонаў, у адным з якіх было 70 пасажыраў, з хуткасцю 8 км/г. Пачатак эры чыгуначнага транспарту.

**1848** год — нямецкія мысліцелі Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс апублікавалі «Маніфест камуністычнай партыі», дзе дэкларуюць і абгрунтоўваюць мэты, задачы і метады барацьбы камуністычных арганізацый і партый, якія ўжо актыўна зараджаліся ў Еўропе.

**1899** год — выйшаў у мора першы ў свеце арктычны ледакол «Ярмак», пабудаваны ў Ньюкасле-на-Тайне на стапелях англійскай фірмы па замове Расіі (праект адмірала С. В. Макарава). 4 сакавіка ён пад камандаваннем свайго першага камандзіра Васільева ўвайшоў у гавань Кранштата.

**1904** год — нарадзіўся Аляксей Мікалаевіч Касыгін, вядомы савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, старшыня Савета Міністраў СССР у 1964—1980 гадах, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы.

Так гаварыў...

**ПУБЛІЙ СІР:**

*«Перанось без скаргаў тое, што немагчыма змяніць».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.17 | 18.29 | 10.12 |
| Віцебск — | 8.10 | 18.16 | 10.06 |
| Магілёў — | 8.08 | 18.19 | 10.11 |
| Гомель — | 8.01 | 18.19 | 10.18 |
| Гродна — | 8.32 | 18.45 | 10.13 |
| Брэст — | 8.29 | 18.49 | 10.20 |

### Месяц

*Першая квадра 16 лютага.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Андрэя, Захара, Сямёна, Фёдара.*
**К.** *Ірэны, Элеаноры, Яўгеніі, Фелікса, Цэзара.*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Дзяўчына пытаецца хлопца:**
**— А ты будзеш мяне кахаць, калі я патаўсцею?**
**— Я ўжо...**

Размаўляюць сяброўкі:
— У майго самага надзейнага сябра рост 190 см.
— Гэта твой новы мужчына?
— Не, халадзільнік.

**— Каханая, перастань плакаць! Што здарылася?**
**— Мае бацькі супраць нашага вяселля.**
**— І ўсяго?! Дурненькая, не хвалюйся, я знайду сабе іншую нявесту.**

— Няма нічога больш кранальнага, чым калі ў вялікай кампаніі людзей да цябе падыходзіць незнаёмы сабака і кладзецца табе пад ногі.
— Так... Калі гэта не аэрапорт, а сабака — не службовы.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.985. Індэкс 63850. Зак. № 374.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 лютага 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12